Падтрымай "Вясну" на PATREON

На затрыманых падчас адкрыцця помніка Леніну актывістаў складзеныя пратаколы

08.11.2016 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў, затрыманні



Затрыманне Зміцера Дашкевіча 7 лістапада 2016 года. Фота Радыё Свабода.

Чатырох актывістаў затрымалі супрацоўнікі міліцыі 7 лістапада пад час адкрыцця помніка Леніну каля прахадной Мінскага трактарнага завода. На цырымоніі адкрыцця помніка, у якой удзельнічаў намеснік старшыні Мінгарвыканкама, першы сакратар ЦК КПБ Ігар Карпенка, актывісты пачалі скандаваць "Ганьба!".


Апоўдні, перад пачатакам мітынгу камуністаў, супрацоўнікі АМАП затрымалі лідэра “Маладога фронту” **Зміцера Дашкевіча.** Яго з прымяненнем гвалту літаральна аднеслі ў мікрааўтобус.


У аддзяленне міліцыі былі дастаўлены таксама актывісты **Сяргей Пальчэўскі, Арцём Леўчанка і Раман Ганчароў**. Пасля складання пратаколаў яны былі адпушчаныя. На Зміцера Дашкевіча склалі тры пратаколы адміністрацыйных правапарушэнняў: 23.34 КаАП («ўдзел у несанкцыянаваным масавым

мерапрыемстве), 17.1 КаАП (дробнае хуліганства) і 23.4 КаАП (непадпарадкаванне службовай асобе). Каля 18-й гадзіны вечара Змітра Дашкевіча вызвалілі. Пазней, у сацыяльных сетках з'явіліся паведамленні, што Зміцера Дашкевіча збівалі ў аўтамабілі і груба зневажалі.


Твитнуть







ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO


HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY